Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

№ 48 (1157)

Снежань 1970 г.

Год выдання 15-ты

Цана 2 кап.

5 СНЕЖНЯ — ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

СЯРГЕЙ ЦІХАН, КАНДЫДАТ МЕДЫЦЫНСКІХ НАВУК, АЎТАР АРТЫКУЛА «ШТО ТРЭБА ДЛЯ ШЧАСЦЯ».

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ШТО ТРЭБА ДЛЯ ШЧАСЦЯ

Гэта было зусім нядаўна, 22 верасня 1970 года. Я абараняў кандыдацкую дысертацыю, і ўсе, хто выступаў у той дзень, называлі мяне «малады вучоны». Мяне віншавалі, паціскалі рукі, а я думаў: «Цікава, як склаўся б мой лёс там, за акіянам, каб я і мая сям'я не вярнуліся ў Беларусь».

Ніколі не забыць, як, жывучы на чужыне, мы прагна лавілі кожную вестачку з Бацькаўшчыны. Слова Радзіма ў маёй свядомасці звязвалася з нечым родным і па-мацярынску пяшчотным. Я не памятаў вёскі Глаўсевічы на Слонімшчыне, дзе нарадзіўся і адкуль у 1937 годзе, калі мне не было і двух год, мае бацькі выехалі ў Аргенціну. Але часта, як толькі старэйшыя пачыналі ўспамінаць, мне здавалася, што і я бачыў раней нашу старую хатку і лес за вёскай, адчуваў водар родных палёў.

Такіх, як мы, тады былі тысячы, а прычына, што прымушала пакінуць Радзіму, адна: беззямелле, прыгнёт, беднасць. Наша сям'я не знайшла на чужыне ні шчасця, ні багацця. Пераязджалі з месца на месца, працавалі многа, а зарабілі мала.

Бацькі вельмі хацелі, каб я і мае браты вучыліся, але вучоба патрабавала вялікіх выдаткаў. Я змог пайсці вучыцца, калі пачалі працаваць браты. Скончыў школу і паступіў ва універсітэт, аднак сумненні не давалі спакою з першага дня. Справа ў тым, што ў Аргенціне пачыналі тады вучыцца многія, а заканчвалі толькі дзесяць працэнтаў з тых, што паступалі. Стыпендыі студэнты не атрымліваюць. Больш за ўсё выдаткаў ідзе на набыццё падручнікаў. За падручнікі па анатоміі трэба было аддаць двухмесячны заработак брата. А тут я плаціў за кнігі літаральна капейкі.

Скончыў медыцынскі інстытут у Мінску, куды мы ўсёй сям'ёй пераехалі ў 1956 годзе. Менавіта з інстытута і пачынаецца маё жыццё на Радзіме. Усё тут іншае: і таварышы, і ўмовы вучобы, і перспектывы пасля заканчэння інстытута. Спачатку было цяжка. Часам прыгадваю свае першыя лекцыі. Выкладчык чытае, а я не паспяваю запісваць, не разумею многіх слоў. Пасля заняткаў прасіў у калег сшыткі і перапісваў лекцыі. Я нават разгубіўся, мне здалося, што адстану ад іншых. Тады я і адчуў пасапраўднаму падтрымку таварышаў, локаць сяброў. Дырэктар інстытута параіў мне пераехаць у студэнцкі інтэрнат. Са мной пачалі займацца таварышы, выкладчыкі заставаліся пасля лекцый і дапамагалі ў тым, што найбольш цяжка давалася. Я думаў, што гэта яны так ставяцца да мяне таму, што я прыехаў з-за мяжы. Але потым зразумеў, што памыляўся. Дапамагаюць кожнаму, хто мае патрэбу. Пакуль вучыўся ў інстытуце, атрымліваў стыпендыю. Кнігі, часопісы браў у бібліятэках, чытальных залах. Падручнікамі з бібліятэкі можна было карыстацца цэлы год.

Хачу сказаць яшчэ аб каштоўнай якасці савецкага выкладання — аб навуковых гуртках. У іх займаюцца тыя студэнты, якія цікавяцца навуковай работай. Пад кіраўніцтвам вопытнага выкладчыка яны пачынаюць свае першыя крокі. Выступаюць з дакладамі ў навуковых гуртках факультэта, потым, у залежнасці ад ступені важнасці работы, на інстытуцкіх, раённых, рэспубліканскіх і саюзных канферэнцыях. Менавіта тут я адчуў цягу да навуковай работы.

І вось непрыкметна прайшло шэсць год. Я стаў урачом! Споўнілася мая першая мара! Цяжка апісаць радасць маю і бацькоў, калі мы разам з жонкай Валянцінай прынеслі дадому дыпломы. Нам, як і ўсім выпускнікам вышэйшых навучальных устаноў, пасля заканчэння быў прадастаўлены месячны адпачынак і работа па спецыяльнасці.

Валянціна пачала працаваць урачом-тэрапеўтам, а я хірургам у адной з паліклінік Мінска. Якое гэта шчасце адчуваць сябе карысным, усведамляць, што ты сваёй працай таксама ўносіш уклад у будаўніцтва новага грамадства. Таму што ў тваіх руках — здароўе людзей.

Пад наглядам старэйшых таварышаў былі зроблены першыя аперацыі, вылечаны першыя хворыя. Урачы перадавалі нам свае веды, вопыт.

Пасля трох год работы ў клініцы я здаў экзамены ў аспірантуру, стаў аспірантам Мінскага медыцынскага інстытута на кафедры аперацыйнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі — на той кафедры, дзе ў студэнцкія гады напісаў першы навуковы артыкул.

Аспірант на працягу трох год павінен напісаць навуковую работу. Яму плацяць стыпендыю, ён забяспечваецца інтэрнатам, карыстаецца навуковай апаратурай, рэактывамі, жывёлінамі для эксперыментальных доследаў і, самае галоўнае, усю работу праводзіць пад кіраўніцтвам вядучых прафесараў. Адным словам, ён атрымлівае ўсё!

Пасля некалькіх год вучобы ў аспірантуры мне прапанавалі работу на кафедры асістэнтам. Я вёў практычныя заняткі са студэнтамі III і IV курсаў інстытута і адначасова рыхтаваў дысертацыю, якую цяпер ужо абараніў. Тэма яе: «Лячэнне колата-рэзаных ран лёгкага ў эксперыменце».

Яшчэ два гады назад, калі быў асістэнтам, чатыры месяцы вучыўся ў Маскве на ўсесаюзных курсах павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў медыцынскіх інстытутаў. Курсы створаны Міністэрствам аховы здароўя СССР з мэтай удасканаліць веды выкладчыкаў, заняткі на іх аплачваюцца дзяржавай.

Чым лепш складваецца мой лёс на Радзіме, тым часцей я звяртаюся ў думках да свайго мінулага. Аб тым, каб не проста лячыць людзей, а стаць вучоным, я не мог і марыць у Аргенціне. Работу мне там ніхто б не прадаставіў. Шукай яе дзе хочаш. У лепшым выпадку ўрачы розных спецыяльнасцей аб'ядноўваюцца і агульнымі сродкамі і намаганнямі адкрываюць паліклінікі. Вытрымаюць канкурэнцыю са старэйшымі калегамі — лічаць, што ім пашанцавала. З'яўляецца свая кліентура і заработак. Але ж чалавеку не толькі грошы патрэбны для шчасця. Што рабіць, калі ён у душы даследчык, эксперыментатар, калі ён хоча рабіць адкрыцці і вынаходніцтвы? Такой магчымасці ў мяне ў Аргенціне не было. Яна ёсць тут, на Радзіме.

Удала склаўся лёс і ў астатніх членаў нашай сям'і. Адзін брат скончыў у Маскве інстытут народнай гаспадаркі, там жыве і працуе. Другі — канструктар Мінскага завода аўтаматычных ліній. Бацькі на пенсіі, жывуць разам са мной. У нас з Валяй двое дзяцей, так што маёй маці клопатаў з малымі хапае.

Усё, да чаго мы імкнуліся, збылося. Мы лічым сябе шчаслівымі людзьмі.

Сяргей ЦІХАН.

блакітныя магістралі... Іх многа ў нашай рэспубліцы. Рэкі, бадай, былі першымі транспартнымі шляхамі чалавека. Спачатку плыты, лодкі, потым — параходы, цеплаходы. І цяпер, у век аўтамабіля і самалёта, скорасных паяздоў і ракет, водныя магістралі не страцілі свайго значэння. Перавозка па вадзе самая танная. Кожны год ад ледаходу да ледаставу ідуць і ідуць па рэках цяжкія і марудныя самаходкі, пасажырскія цеплаходы, буксіры з баржамі, імкліва праносяцца скорасныя «Ракеты» на падводных крылах.

З пачатку навігацыі юбілейнага года рачнікі рэспублікі перавезлі 7,3 мільёна тон руды, вугалю, мінеральных угнаенняў, лесу і іншых грузаў.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Капітан цеплахода «Іпуць» Мікалай НЕРУШАЎ. 2. У рачным порце Пхоў.

СТАНКІ НА ЭКСПАРТ

Станкі мінскага завода імя Кірава адпраўляюцца ў многія краіны свету. Бельгія, ГДР, Балгарыя, Польшча, КНДР — такі далёка не поўны пералік дзяржаў, куды ідзе прадукцыя старэйшага станкабудаўнічага прадпрыемства рэспублікі.

У адрас машынабудаўнічых фірм Індыі адпраўлены чатыры адразныя станкі. Рыхтуюцца да пастаўкі ў Польшчу два вертыкальна - працяжныя станкі.

НАДЗЕЙНЫ ПАМОЧНІК

Мантаж электронна-вылічальнай машыны «Мір» вядзецца ў вылічальным цэнтры Мінскага аўтазавода. Яна дазволіць намнога хутчэй выконваць планава-эканамічныя і бухгалтарскія разлікі, з'явіцца добрым памочнікам канструктараў, тэхнолагаў і іншых спецыялістаў прадпрыемства.

Работнікі вылічальнага цэнтра, якія будуць абслугоўваць «Мір», прайшлі практыку на Кіеўскім заводзе электронных вылічальных машын.

НА ПРЫЛАЎКАХ — «ГАРЫЗОНТ-101»

На прылаўках Цэнтральнага універмага «Мінск» з'явілася навінка — шматканальны тэлевізар «Гарызонт-101», які мае самы вялікі экран — 65 сантыметраў.

«Гарызонт-101» Мінскага радыёзавода — адзіны тэлевізар першага класа, які серыйна выпускаецца ў нашай краіне. Па сваіх тэхнічных даных ён пераўзыходзіць многія айчынныя і замежныя ўзоры.

Футарал тэлевізара аздоблен каштоўнымі пародамі дрэва і пакрыт поліэфірным лакам. Асноўныя ручкі кіравання вынесены на пярэднюю панель. Прыёмнік устаноўлен на ножках.

СМАЧНАЯ ПРАДУКЦЫЯ

У многія адрасы краіны адпраўляе сваю прадукцыю Полацкі кансервавы завод. Нядаўна на выстаўцы ў абласным цэнтры многія яго вырабы былі ацэнены высокім балам.

Сёлета заводскі калектыў асвоіў выпуск сямі новых відаў прадукцыі. Гэта — кроп кансерваваны, сок бярозавы, пячэнне аўсянае, квас «Рускі» і інш. У бліжэйшы час прадпрыемства пачне выпуск кансерваваных салатаў са свежай капусты, журавін у цукровай пудры, вафляў.

ДЛЯ ДОБРУШСКІХ ПАСАЖЫРАЎ

Новы чыгуначны вакзал узводзіцца ў Добрушы. Асноўныя будаўнічыя работы ўжо завершаны. Зараз вядзецца аддзелка памяшканняў, мантаж абсталявання ў іх і пракладка камунікацый.

Будынак узведзены ў сучасным архітэктурным стылі. Ён будзе мець максімум зручнасцей для пасажыраў і абслугоўваючага персаналу.

У 56 КРАІН

Прыборы ў век аўтаматыкі і электронікі адыгрываюць вядучую ролю. Нядаўна канструктарская група спецыяльнага канструктарскага бюро Віцебскага завода электравымяральных прыбораў прапанавала пераўтваральнікі, якія ўстанаўліваюцца на энергаблоках электрастанцый і ўключаюцца ў аўтаматычную сістэму кіравання. У параўнанні з наяўнымі прыборамі падобнага тыпу віцебскія будуць больш эканамічныя. Цяпер група канструктараў пачала стварэнне прыбора новага арыгінальнага тыпу — кампенсацыйнага вымяральнага пераўтваральніка для змянення велічыні пераменнага току. Прыборы завода, акрамя ўнутранага рынку, купляюць яшчэ 56 краін свету.



КАРТЫ ГЕАЛАГІЧНАЙ ГІСТОРЫІ

Больш як сорак карт рознага тыпу складуць атлас, які адлюстроўвае геалагічнае мінулае рэспублікі. Гэта вынік трохгадовай работы вялікай групы навуковых супрацоўнікаў Беларускага навукова-даследчага геолагаразведвальнага інстытута, якая ажыццяўлялася па праграме Савета Эканамічнай Узаемадапамогі.

Вучоныя працавалі па адзінай новай методыцы і асвятлялі геалагічную будову раёна. Характарызуецца рэчавы састаў парод, пачынаючы ад старажытных, што маюць узрост звыш аднаго мільярда гадоў, і да «маладых», якія налічваюць больш аднаго мільёна гадоў. Даследчыкі зрабілі цікавую спробу запоўніць прагалы па асобных геалагічных адрэзках і ў залежнасці ад агульнага напрамку развіцця тэрыторыі далі ім адпаведную ацэнку.

Комплекс геалагічных карт, якія маюць тэарэтычнае і практычнае значэнне, асабліва дэталёвы ў характарыстыцы дэвонскага перыяду. У дзвюх спецыяльных картах адлюстраваны пытанні нафтагазаноснасці, а ў адной — элементы тэктонікі Беларусі. Гэта аблегчыць пошукі нафты, газу і іншых карысных выкапняў у перспектыўных раёнах.

РОСТ ЗАРАБОТНОЙ ПЛАТЫ В СССР

За последние годы на основе успешного развития экономики в СССР осуществлены меры большой социальной важности, заметно повысившие материальное благосостояние советских людей. Причем весомость этих мер постоянно возрастает. Достаточно сказать, что среднегодовой прирост фонда общественного потребления в нынешней пятилетке увеличился против предыдущего пятилетия почти на 70 процентов.

В условиях социалистического общества, где орудия и средства производства являются общенародной собственностью, — это естественный, закономерный процесс. Сущность его состоит в двуединой связи и взаимном влиянии: с одной стороны, общий средний уровень оплаты по труду, как и других источников потребления, определяется уровнем национального дохода, с другой — сама заработная плата при правильной ее организации выступает как мощный материальный стимул роста производительности труда, увеличения выпуска продукции, повышения ее качества.

Заработная плата в СССР — основной источник удовлетворения материальных и культурных потребностей рабочих и служащих и составляет примерно 75 процентов общей суммы их доходов. Значительную роль в бюджете трудящихся играют различные материальные льготы, получаемые ими из общественных фондов потребления.

Вопросам оплаты труда, правильной ее организации, обеспечения постоянного ее роста в СССР придается важное значение. В решениях съездов Коммунистической партии определяются контрольные задания по повышению заработной платы и основные направления совершенствования ее организации. В соответствии с этим проводится вся работа государственных, хозяйственных органов и профсоюзов по повышению и упорядочению заработной платы, совершенствованию премиальной системы и других условий оплаты труда. Так, только за два последних года минувшего пятилетия — в течение 1964—1965 годов — была повышена в среднем на 21 процент заработная плата 20 миллионам рабочих, специалистов и служащих, работников просвещения, здравоохранения, культуры, торговли, общественного питания, жилищно-коммунального хозяйства и других отраслей народного хозяйства, непосредственно обслуживающих население.

Директивами XXIII съезда КПСС по пятилетнему плану развития народного хозяйства СССР на 1966—1970 гг. предусматривалось повысить заработную плату рабочих и служащих в среднем не менее чем на 20 процентов. С 1 января 1968 года был повышен минимальный размер заработной платы рабочим и служащим всех отраслей народного хозяйства до 60 рублей, а отдельным категориям работников — до 70 рублей в месяц. Такое высокое единовременное увеличение минимальных тарифных ставок и должностных окладов для рабочих и служащих всех отраслей народного хозяйства осуществлено в СССР впервые. При этом следует также учесть, что реальные доходы низкооплачиваемых работников возросли еще в большей степени в связи со снижением налогов на 25 процентов рабочим и служащим с заработками от 61 до 80 рублей в месяц.

В 1968 году были также повышены в среднем на 15 процентов тарифные ставки рабочих, занятых обработкой металла и других материалов на машиностроительных и металлообрабатывающих предприятиях. Заработная плата была увеличена более чем 1, 4 миллиона рабочих-станочников всех отраслей народного хозяйства.

Постановлением ЦК КПСС, Совета Министров СССР и ВЦСПС, принятым в декабре 1968 года, тарифные ставки рабочих, занятых в строительстве и на ремонтно-строительных работах, были повышены в среднем на 25 процентов.

Для молодых строителей наряду с введением более высоких ставок предусмотрены дополнительные льготы. В частности, руководителям строительно - монтажных и ремонтно - строительных организаций предоставлено право устанавливать этим рабочим пониженные нормы выработки до 40 процентов в первые три месяца их самостоятельной работы и до 20 процентов — в последующие три месяца.

В результате введения новых условий оплаты труда значительно улучшились показатели работы строительных организаций, возросла производительность труда. Например, производительность труда в целом по отрасли строительства увеличилась в IV квартале 1968 года на 6,9 процента, а заработная плата — на 11,8 процента; в 1 квартале 1970 года по сравнению с тем же периодом предыдущего года производительность труда в строительстве вновь возросла на 7,3 процента, а заработная плата — на 14 процентов.

На основании Постановления ЦК КПСС, Совета Министров СССР и ВЦСПС, также принятого в декабре 1968 года, в 1969 году повышены тарифные ставки рабочих и должностные оклады инженерно - технических работников и служащих, занятых во всех отраслях промышленности строительных материалов, стекольной и фарфоро-фаянсовой прымышленности.

Новые тарифные ставки рабочих теперь выше ранее действовавших в среднем на 23 процента, должностные оклады инженерно - технических работников — на 9 процентов, оклады служащих — на 8, 5 процента.

На новые условия оплаты труда в строительстве, промышленности строительных материалов, в стекольной и фарфоро-фаянсовой промышленности в 1969 году переведено около 9 миллионов рабочих, служащих и инженерно - технических работников.

В нынешнем пятилетии в большинстве отраслей народного хозяйства СССР внедрена новая система планирования и экономического стимулирования. Это позволило в соответствии с решениями XXIII съезда КПСС значительно усилить материальное стимулирование коллективов предприятий, добившихся улучшения производственно-хозяйственной деятельности. В промышленности, где уже введена новая экономическая реформа, практикуется премирование рабочих, инженерно-технических работников и служащих из фонда материального поощрения, образуемого за счет прибыли предприятий. Этот фонд в настоящее время составляет внушительную сумму, примерно 4,5—5 миллиардов рублей.

Решениями XXIII съезда КПСС предусматривалось в нынешнем пятилетии повысить заработную плату рабочих и служащих не менее чем на 20 процентов. Фактически, с учетом перечисленных мер по повышению заработной платы, а также дальнейшего увеличения премий, расширения контингента премируемых, заработная плата рабочих и служащих в течение этой пятилетки возрастет на 26 процентов. Таким образом, среднегодовой прирост заработной платы составляет 4,7 процента против 3,7 процента, которые намечались Директивами XXIII съезда КПСС.

Приведенные данные свидетельствуют о том, что заработная плата в СССР по мере укрепления экономики страны имеет устойчивую тенденцию непрерывного роста.

М. МАРКИН,
заместитель заведующего отделом заработной платы и экономической работы ВЦСПС.

СЕГОДНЯ В НОМЕРЕ

ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ ЧИТАЕТ ПО-БЕЛОРУССКИ

Безземелье и нищета заставили семью Сергея Тихона в 1937 году выехать из бывшей Западной Белоруссии в Аргентину, но и за океаном люди не нашли ни счастья, ни богатства. Родители мечтали дать сыновьям высшее образование, а осуществить мечту смогли только после возвращения на Родину в 1956 году. Закончив Минский медицинский институт, а потом аспирантуру, Сергей Тихон защитил диссертацию и получил степень кандидата медицинских наук («ШТО ТРЭБА ДЛЯ ШЧАСЦЯ», 1 стр.].

Со времени основания бумажной фабрики князя Паскевича, ныне Добрушского целлюлозно-бумажного комбината, трудится здесь рабочая династия Агеевых («ГУЧНАЕ ПРОЗВІШЧА», 3 стр.]. Прадеды возводили корпуса предприятия, деды и отцы участвовали в революционных событиях 1917 года и восстанавливали комбинат в послевоенные годы. Сейчас их дела с честью продолжают внуки и правнуки.

В письме «У АМЕРЫЦЫ ПАСЯЛІЛІСЯ ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ» [4 стр.] наша соотечественница Вера Кляцко рассказывает о своей судьбе, полной лишений и забот. В преклонном возрасте взяла она в руки кисть и краски, чтобы возродить на холсте дорогие сердцу воспоминания детства. Пейзажи В. Кляцко наполнены грустным лиризмом, теплотой и искренностью.

Недавно исполнилось 70 лет со дня рождения белорусского поэта Н. Чернушевича. Уже в первых его поэтических сборниках в полный голос зазвучала тема борьбы за свободу и счастье человечества, вера в светлое будущее родной земли и огромные духовные возможности ее народа. Обращаясь к творчеству поэта, вновь и вновь убеждаешься в том, что это было его жизненным и творческим направлением, которому он остался верен всю свою жизнь («ПАЗЫЎНЫЯ Ў ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ», 7 стр.].

С 1951 года начинается творческий путь самодеятельного хора деревни Барово Ивьевского района. С той поры коллектив является постоянным участником всех смотров и конкурсов, завоевывает симпатию любителей народной музыки. Вместе с популярностью пришло и признание. Об этом свидетельствуют многочисленные дипломы и грамоты, которыми награжден хор. На III декаде белорусского искусства в 1965 году ему было присвоено почетное звание народного («ЗАЙГРАЙЦЕ, МУЗЫКІ», 7 стр.].

ГУЧНАЕ ПРОЗВІШЧА

РАСКАЗ АБ РАБОЧАЙ ДЫНАСТЫІ І КАМБІНАЦЕ, ЯКІМ СПОЎНІЛАСЯ 100 ГАДОЎ

Запа дома культуры, здавалася, раскалолася ад апладысментаў.

— Узнагароджваецца за выдатную работу ў сувязі са стагоддзем Добрушскага цэлюлозна - папяровага камбіната Агееў Віктар Васільевіч...

Да прэзідыума паміж радамі ішоў невысокі, бялявы рабочы са светлымі вясёлымі вачыма.

Я бачыў яго яшчэ раніцай у цэху. Ён стаяў ля пульта кіравання машынай, крыху сутулячыся, шырока расставіўшы ногі, як стаяць у рубцы капітаны. З машыны збягала папяровая стужка, але здавалася, што гэта сама машына бяжыць па белай быстрыні наперад. Пальцы Віктара мякка націскалі кнопкі пульта.

— Агеевы — гучнае прозвішча, — сказаў мой сусед, калі Віктар ішоў міма нас да прэзідыума.

* * *

Сонца паўлінавым хвастом распусціла свае праменні, уздымаючыся над сонным выгібам Іпуці. А Іван Агееў працаваў ужо каторую гадзіну без адпачынку. Ляцела з-пад тапара беласнежная стружка. З працяжным стогнам падала дрэва. У вачах Івана, светлых, як злінялая кашуля, што трашчала на яго плячах, скакала гарэзлівая радасць. «Гэта ж трэба, такое шчасце чалавеку! Да карэнных Шараёў у зяці прыбіўся. Паскевіч-князь папяровую фабрыку ставіць — на работу ўзяў».

— Добжэ працуеш, хлоп,— пачуў ён за спіной голас майстра Пісянецкага, — бардзо. Старайся. Дзесятнікам паставім.

Замільгала сякера ў руках Івана часцей. «Можа, у людзі выб'юся. Баба хлопцаў народзіць. Гаспадаром стану».

І сапраўды, нарадзіла жонка Івану добрых сыноў. Белагаловых, светлавокіх — у яго. А вось гаспадаром Агееў не стаў. Іван усіх сыноў, як казалі на пасёлку, у адной світцы жаніў. Устала фабрыка Паскевіча — дымам заслала неба, раку, лясы. І ў Івана быццам пацямнела ў вачах. Не паўтарыліся для яго больш яркія світанкі на Іпуці. Фарбы пагаслі. Душа аслепла. Заходзіў ён да сыноў у цэхі, вузкія, сырыя, напоўненыя парай.

Асабліва шчымела сэрца, калі прыходзіў да Сямёна ў адбелку. З'едзенымі да болек рукамі той сыпаў у кацёл каўстык, хлорку, соду: рыхтаваў шчолач. Аднойчы Іван не вытрымаў, сказаў майстру Мацевічу:

— Рукавіцы б хлопцу выдалі. Ці ж гэта па-гаспадарску — работніка губіць?

— Я табе пакажу, хто тут гаспадар, — развярнуўся Мацевіч і з усяго маху кашчавай рукой ударыў Івана па твары.

У прахадной стрэў Сямён Івана Мухарава. «Прыходзь пад вечар на пустэчу за Іпуць»,— кінуў той. Калі Агеевы на змярканні перабраліся праз раку, яны сустрэлі дзесяткі два знаёмых рабочых. Хутка ў ленінскай «Іскры» з'явілася заметка аб бясчынствах на Добрушскай папяровай фабрыцы.

* * *

Яшчэ ў Беларусі ішлі баі, а Васіль Агееў вярнуўся дадому з перабітай рукой. Прыйшоў да свайго камбіната — з-пад глыбокага снегу толькі абгарэлыя сцены тырчаць. «Вось што фашыст з намі зрабіў», — горка падумаў ён. А праз тыдзень пачуў, што прыбыло на камбінат абсталяванне. Зноў прыйшоў Агееў на камбінат.

— Куды табе з тваёй рукой? — спрабаваў адгаварыць яго дырэктар Галкін.

— Людзям на фронце цяжэй...

У той жа дзень Васіль ужо цягаў волакам на вяроўцы трубы з вагонаў на камбінат. Потым дырэктар недзе дастаў лакамабіль і паравоз. З'явілася на камбінаце энергія.

Васіль трапіў у брыгаду слесараў Пятра Цімошкіна, што аднаўляла сістэму труб, па якой павінны былі забіць пара, вада, масла, каб ажыла вытворчасць.

Працавалі ў раскрытых, яшчэ не падведзеных пад дах цэхах. Скразняк ледзяніў цела. Рукі стылі ад прамёрзлых гаечных ключоў. Механізацыі ніякай не было, і Васіль з таварышамі цягаў на сваіх плячах многапудовыя трубы на другі паверх. І так працавалі дзень за днём, месяц за месяцам і падрыхтавалі машыны да пуску.

* * *

Адсюль, са сцэны, дзе стаіць Віктар Агееў, з прэзідыума, відаць усе сваякі. Вунь сястра Валянціна, другая сястра — Надзея, таксама каландроўшчыцай працуе. Дзед Сямён не дажыў. Але браты яго, Іван і Пётр, жывыя. Вунь бацька Васіль побач з цёткай Фядорай. Тут і яе сыны — Рыгор, Аляксандр, Леанід. Далей матчыны браты — Дземуковы. І яшчэ ззяючымі вачыма глядзіць з залы на Віктара малодшы брат Міхаіл. Ён пакуль вучыцца. Але пройдзе год, і Міхаіл скончыць вучылішча і прыдзе на камбінат сетачнікам. Тады рабочай дынастыі Агеевых і камбінату пойдзе другое стагоддзе.

Ф. РАДЗІЁНАЎ.

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

БЕРАСТОВІЦКІ раён па плошчы самы малы ў Гродзенскай вобласці. Нягледзячы на гэта, колькасць вучоных, выхадцаў з раёна, даволі прыкметная. Вось імёны толькі некалькіх навуковых работнікаў, выпускнікоў Вялікаберастовіцкай сярэдняй школы: кандыдат філалагічных навук Э. Блінова, кандыдаты хімічных навук М. Дарашкевіч і фізіка-матэматычных навук В. Алясюк, кандыдаты медыцынскіх навук Г. Жыліцкая і М. Янчэўскі, кандыдат філасофскіх навук А. Бароўскі.

Выпускнік Малаберастовіцкай школы С. Габрусевіч з вёскі Верхаўляны абараніў кандыдацкую дысертацыю па філасофіі і цяпер працуе ў Гродзенскім педагагічным інстытуце імя Янкі Купалы. Ул. Карпуць з вёскі Даўбянкі—кандыдат сельскагаспадарчых навук, ён выкладае ў ветэрынарным інстытуце ў Віцебску.

Ужо цяпер з кожных 3 тысяч жыхароў раёна выйшаў адзін вучоны. Некаторыя з іх працуюць за межамі рэспублікі.

Паэт з Берастовіцкага раёна Іван Летка ў гэтым годзе выдаў другі свой зборнік вершаў—«Тры верасні». Ніна Андрушэвіч з вёскі Рудаўляны і Віктар Шыцік з Церахоўкі—журналісты.

С. КУРЫЛА.

МІНСКІ вагонарамонтны завод імя А. Мяснікова — ветэран сярод прадпрыемстваў рэспублікі. Гісторыя яго пачынаецца ў 1871 годзе, калі ў Мінску былі пабудаваны майстэрні па рамонту паравозаў і вагонаў. Гэта было прадпрыемства амаль саматужнага тыпу. Усе работы вяліся ўручную. Працаваць даводзілася па 12—14 гадзін у суткі. Урачэбная дапамога адсутнічала. Ды і адкуль яна магла быць у майстэрнях, калі па ўсёй Аляксандраўскай чыгунцы было толькі 8 урачоў.

Гэта далёкае мінулае завода. Сягоння тут адзін толькі медпункт займае пяць вялікіх светлых пакояў, дзе працуюць высокакваліфікаваныя медыцынскія работнікі. Кабінеты абсталяваны навейшымі апаратамі і прыборамі. Усе рабочыя і служачыя рэгулярна, два разы ў год, праходзяць прафілактычны агляд. На прадпрыемстве зусім няма прафесіянальных захворванняў.

Заводам майстэрні сталі ў 1917 годзе. А ў 1932 годзе прадпрыемству было прысвоена імя Мяснікова, выдатнага дзеяча ленінскай партыі, з чыім імем звязана перамога Кастрычніка ў Беларусі.

Першая і асабліва другая сусветная войны нанеслі заводу вялізныя страты. Цэхі былі разбураны, каштоўнае абсталяванне вывезена ў Германію. Але праз некалькі месяцаў пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на заводзе ўжо былі адрамантаваны першыя дзесяткі калёсных пар.

Ішлі гады. Раслі новыя карпусы. Устанаўлівалася новае абсталяванне. Раней завод рамантаваў толькі драўляныя пасажырскія вагоны, а зараз—цэльнаметалічныя. Пашыраны малярныя і разборчае аддзяленні, аддзяленне электрычных прыбораў.

В. ШЫХАНЦОЎ.

ЯК АДПАЧЫВАЛАСЯ, Франц Іванавіч?—гэта пытанне ў першы ж дзень выхаду пасля водпуску на работу Франц Палькоўскі чуў ад многіх калгаснікаў. Па прафсаюзнай пуцёўцы хлебароб адпачываў у Сочы, у санаторыі.

І не толькі Палькоўскі з калгаса імя Гагарына Воранаўскага раёна ездзіў на курорт. Па прафсаюзных пуцёўках пабывалі сёлета на поўдні калгаснікі Іосіф Кажанеўскі, Уладзімір Салавей, Іван Логінаў, Зігмунд Мікуць, Вікенцій Кутыш — усяго больш дзесяці чалавек. Сёлета з калгасаў Воранаўскага раёна ў санаторыях і дамах адпачынку пабывала амаль паўтары сотні хлебаробаў.

Л. СЦЕФАНОВІЧ.

У СЛУЦКІМ раёне працуе 180 бібліятэк з агульным кніжным фондам больш як 410 000 тамоў мастацкай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай і іншай літаратуры. Чытачамі сельскіх бібліятэк з'яўляюцца 40 000 чалавек.

Мнагалюдна бывае вечарамі ў Мялешкаўскай сельскай бібліятэцы. Многа чытаюць трактарыст Міхаіл Масюк, шафёр Анатоль Калядка, камбайнер Юлій Бандура, палявод Вячаслаў Валатоўскі і іншыя. Бібліятэкі ўвесь час папаўняюцца новымі кнігамі.

М. СЯУРУК.



НАФТА НА БЕЛАРУСІ

Адкрыццё нафтавых пакладаў на Беларусі стала падзеяй не толькі агульнасаюзнага, але і еўрапейскага маштабу. Так, польскі часопіс «Пшэкруй» нядаўна пісаў наступнае:

«У Польшчы мы ўсё яшчэ чакаем адкрыцця «вялікай нафты». У Савецкай Беларусі яе ўжо адкрылі, і — па еўрапейскіх крытэрыях — вялікую: здабыча яшчэ ў гэтым годзе складзе 5 мільёнаў тон, а на працягу некалькіх год павінна дасягнуць узроўню ў 3-4 разы вышэйшага.

У параўнанні з глабальнай вытворчасцю нафты ў СССР, якая дасягае ўжо 350 мільёнаў тон у год, гэта нямнога. Але ў Еўропе Беларусь мае шанцы вылучыцца неўзабаве нават на першае месца! Значэнне адкрытых пакладаў павялічваецца тым, што беларуская нафта мае найвышэйшую якасць, без значных прымесяў серы».

Восем мільёнаў веласіпедаў, больш за паўтара мільёна матацыклаў выйшлі з варот Мінскага мотавелазавода за час яго існавання. Ззяючы свежай фарбай, з канвеера сыходзяць усё новыя і новыя машыны. Сотні іх штодзень адпраўляюцца ў розныя куткі нашай краіны і на экспарт.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

У АМЕРЫЦЫ ПАСЯЛІЛІСЯ ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

Вынесены ў загаловак радок з пісьма, якое публікуецца ніжэй, датычыць не толькі дзяцей і ўнукаў В. Кляцко і яе брата, але і самой Веры Антонаўны. Прачытаўшы пісьмо, паглядзеўшы фатаграфіі яе карцін і адзін арыгінал, які ёсць у рэдакцыі, мы не без засмучэння можам сказаць: наша Беларусь страціла мастака. Таму што здольнасць да мастацкага ўспрыняцця свету, выяўленая ў семдзесят з лішнім год, ёсць бясспрэчная адзнака таленту, які мог бы развіцца і расквітнець у маладосці, але быў загублены беднасцю, нягодамі, адарванасцю ад Радзімы, вандраваннямі па чужыне. Трэба мець тонкі і багаты на ўяўленне розум, каб на працягу дзесяцігоддзяў, пражытых далёка ад бацькоўскага дому, захаваць у памяці прыгажосць роднай прыроды, песню жаўрука над нівай, духмянасць свежаскошанага сена, вобразы спелага жыта і вясковай вуліцы ў дажджлівае надвор'е. Трэба валодаць бязмежным пачуццём любві да ўсяго роднага, каб цяпер, на схіле гадоў, глядзець на амерыканскі пейзаж і бачыць у ім беларускія бярозкі, подку, рыбака... Зрэшты, вось словы самой Веры Антонаўны: «Гэта не вельмі ўдала сфатаграфаваная карцінка— копія з календара. Яна мне нагадвае млын у невялікім засценку Мельнікі ў трох вярстах ад вёскі Вялешына. Таму я тут намалявала беластволыя беларускія бярозкі і каля бярозак ледзь прыкметную лодку. На ёй рыбак з вудачкай, з ім у лодцы сабачка...»

Прачытаўшы гэтыя радкі, хочацца ўсклікнуць: «Час, вярніся!» Была б гэта жанчына з намі, сярод сваіх людзей і роднай прыроды, талент яе, бясспрэчна, раскрыўся б і расквітнеў. Але час беззваротны.

Нарадзілася я ў Мінскай вобласці, Капыльскім раёне, у вёсцы Вялешына 1-е. Як большасць вялешынцаў, нарадзілася ў беднай сям'і. Зямлі ў нас было чвэрць валокі—8 дзесяцін. Памятаю, толькі Быткоўскі і яшчэ пара сем'яў у канцы вёскі мелі па цэлай валоцы зямлі.

Чаму ж з такой неабсяжнай, такой багатай рэсурсамі краіны разбрылося нас так многа па свеце? У Вялешыне яшчэ ёсць некалькі старых майго ўзросту, якія могуць адказаць на гэта пытанне. Яны скажуць, што амаль з кожнай сям'і, якая мела па чвэрці валокі зямлі, нехта некуды ад'язджаў або наймаўся на работу да памешчыка. Гэтак жа здарылася і з намі.

Наша сям'я была невялікая, дзяцей толькі чацвёра: старэйшая сястра Кацярына, старэйшы брат Канстанцін, малодшы брат Васіль, паміж імі пяцёра дзяцей памёрлі, і я, самая малодшая. Памёршых братоў і сясцёр не памятаю. Не памятаю таксама і бацькі.

Калі Канстанціну споўнілася дваццаць год, ён задумаў жаніцца. А як раздзяліць з малодшым братам маёмасць, старую хату, 8 дзесяцін зямлі? Ды і мне патрэбен нейкі пасаг.

Ён парэіўся з маці і дзяўчынай, якую кахаў, і вырашыў ехаць у Амерыку, каб зарабіць долары. Маўляў, заробіць іх, вернецца дадому, абмяняе кожны долар на два рублі і ўсё будзе выдатна, як у казцы. Але так не атрымалася.

У 1905 годзе брат і яшчэ некалькі хлопцаў з вёскі паехалі ў Амерыку. Мне было 9 год. Жылі мы нядрэнна—сям'я ж невялікая. Але ў той год на нас абрушыліся розныя няшчасці. У час пажару згарэла ўся наша сядзіба. Пажар здарыўся ноччу, і мы нічога не змаглі выратаваць. Таму брат працаваў у Амерыцы тры гады, каб аднавіць гаспадарку. Хату пабудавалі. І што ж? Усё тая ж хата, тыя ж 8 дзесяцін зямлі...

У 1913 годзе памёрла маці. Мне некуды было дзецца. Канстанцін прыслаў шыф-карту (білет), і я назаўсёды пакінула родны край. У Амерыцы ў 1916 годзе сустрэла земляка з вёскі Кукавічы, вышла за яго замуж.

Усюды нашаму простаму Івану даводзілася выконваць цяжкую работу. А работы не хапала для ўсіх. Уздымы змяняліся крызісамі. Закрыецца фабрыка — эмігрантаў выкідваюць за вароты. Мой муж яшчэ ў Расіі быў членам сацыял-дэмакратычнай партыі і арганізоўваў рабочых на барацьбу за свае правы. У Амерыцы ён таксама ўдзельнічаў у рабочым руху. З-за гэтага наша сям'я пакутавала. Калі муж заставаўся беспрацоўным, я мыла бялізну або шыла. Мы доўга вандравалі па краіне, не маючы свайго кутка.

Потым выраслі, скончылі вучобу і пайшлі працаваць дзве старэйшыя дачкі. У 1940 годзе мы купілі домік. Жыць стала лягчэй.

Я ўжо даўно на пенсіі. Яна, праўда, невялікая, але пражыць можна. Мы перасяліліся ў Каліфорнію, дзе цяплей. І хоць на грошы я не багатая, але затое маю многа вольнага часу. Таму да 71 года майго нараджэння мае разумніцы-дочкі падарылі мне фарбы, пэндзлі і дапаможнік па маляванню. За гэту справу я ўзялася сур'ёзна. Зразумела, многа фарбы сапсавала, але цяпер у мяне ўсё быццам выходзіць нядрэнна.

Як бачыце, былі ў мяне і гора, і бяда, і радасці. Выраслі дзеці, а цяпер ёсць пяць унукаў і адзін праўнук. У брата, які памёр у 1953 годзе, два сыны, дачка, сем унукаў, тры праўнукі. Думаю, што мы з Канстанцінам засялілі Амерыку добрымі людзьмі, і таму лічу сябе шчаслівай. Здароўе ў мяне добрае.

У 1966 годзе збылася мая мара—я наведала Радзіму. Шкадую, што выпала мала часу пагасціць у роднай вёсцы. Калі сказаць па праўдзе, я спадзявалася ўбачыць родныя вёскі ў лепшым становішчы, але ці мне судзіць аб гэтым? Наш жа народ прайшоў дзве вялікія вайны, перанёс многа гора. Памятаю, як мы ў Амерыцы, якая ніколі не ведала вайны, у першыя гады асвятлялі хаціны газай і ацяплялі вугалем. А ў вас цяпер усюды электрычнасць. Жыццё ў вёсцы ўвесь час паляпшаецца. Мае сваякі пішуць, што многія маюць аўтамабілі, тэлевізары, пральныя машыны, пылососы. Гэта мяне вельмі радуе.

Мы заўсёды будзем любіць і паважаць Расію—нашу Радзіму, рускі народ. Мы жадаем і заўсёды будзем жадаць вам шчасця.

Больш за ўсё я люблю маю родную вёску Вялешына. Гэта любоў з дзяцінства ўрэзалася ў маё сэрца. Памятаю, я нават не заўважала сваёй беднасці, і калі не была галоднай, то заўсёды знаходзіла мноства цікавых уражанняў. Памяць мая захавала вобраз спелага жыта, песню жаўрука над нівамі, духмянасць свежаскошанага сена. Памятаю лета, зіму, восень—змена ўсіх пор году пасвойму радавала і прыводзіла мяне ў захапленне. Я любіла нават нашу крывую, у дажджлівы час брудную вуліцу. У добрае надвор'е мы яе ў суботу падмяталі, і гэта прыводзіла мяне ў святочны стан. Аб усім родным, што я любіла і люблю, я магла б пісаць бясконца...

А вось дзеці не ведаюць маю Радзіму, у іх радзіма іншая, свая. І ўсё ж па маіх расказах яны паважаюць маю, не знаёмую ім Радзіму, хоць іх любоў і прызнанне належаць Амерыцы.

У час майго наведання Савецкай краіны я сказала ў Маскве, што я люблю абедзве мае краіны, аднолькава паважаю добрыя традыцыі абедзвюх краін і хачу, каб яны паміж сабой не сварыліся.

Вера КЛЯЦКО.

ЗША.



«Прыбой». Мал. **В. КЛЯЦКО.**

•

ДОРОГИЕ товарищи из Белорусского товарищества и редакции газеты «Голас Радзімы»! Посланные вами книги и календари я получила.

Мои ученики очень рады календарям. Они уже нашли в них знаменательные даты: праздники, дни рождения французских писателей и поэтов. Нашли они также и юбилейные даты советских людей.

Этот учебный год мы начали с шестью учениками, однако я думаю, что их будет больше, так как визит президента Франции в Советский Союз значительно повысил интерес французской молодежи к изучению русского языка.

Клара БЕРНАР.

Франция.

•

ВЫ не можаце сабе ўявіць, з якім задавальненнем я праглядаю прысланыя вамі кнігі. Я вельмі даражу кожнай вестачкай з Радзімы, якую я не бачыла ўжо 35 год. Так, роўна столькі я не была на зямлі бацькоў, не бачыла роднага гнязда. Але цяпер ужо, здаецца, мае матэрыяльныя справы пайшлі на лад, і, магчыма, у будучым годзе я змагу пабываць у Савецкім Саюзе.

А цяпер хачу расказаць аб сустрэчы з савецкімі артыстамі тут у нас у Бірмінгеме. Яны давалі канцэрт. У іх рэпертуары былі і старадаўнія песні, выконвалі яны і рускія танцы. Якое гэта было цудоўнае відовішча! Зала, дзе выступалі рускія, была перапоўнена. Сярод гледачоў—не толькі нашы землякі, але і мясцовыя жыхары. Побач са мной сядзела пажылая англічанка. Пасля кожнага нумара яна разам з усімі ўставала і апладзіравала выканаўцам, з захапленнем гаварыла: «Well done, Russians!»

Пасля канцэрта гледачы доўга не разыходзіліся. Ім хацелася пагаварыць з савецкімі людзьмі, абмяняцца сувенірамі. Я атрымала невялічкі значок з сілуэтам Ул. І. Леніна. Гэта вельмі дарагі для мяне падарунак.

Хацелася б, каб часцей адбываліся такія сустрэчы, на якіх людзі розных нацыянальнасцей маглі лепш пазнаваць адзін аднаго.

Анастасія ДЗІТРЫДЖ.

Англія.

БЕЗ ДРУЗЕЙ ЗАМИРАЕТ ЖИЗНЬ

Уважаемые соотечественники!

Простите за долгое молчание. Я не совсем здоров. Старость, да еще на чужбине, в эмиграции, — тяжелое бремя. Скоро мне исполнится восемь десятков. Из них следует вычесть шестьдесят долгих и трудных лет, прожитых мною в Америке.

Теперь, на склоне человеческого века, приходится переоценивать ценности. Уверен, если бы я прожил эти годы на Родине, даже в тех условиях, которые раньше существовали в деревне, я чувствовал бы себя более здоровым и бодрым. А главное — счастливым.

Да, кто-то правильно сказал: «Без друзей замирает жизнь». Нынешнее лето я провел, можно сказать, в одиночестве. Много читал, а вот поделиться мыслями, впечатлениями не с кем. Лишь 6-го сентября ездил в Арров-парк. Присутствовал на открытии памятников великим поэтам нашей Родины А. Пушкину и Т. Шевченко. Там только и встретился со многими старыми знакомыми, с которыми когда-то вместе трудились в русских культурно-просветительных организациях в США.

Меня всегда радуют письма от родных из моей Белоруссии. Они счастливы, довольны жизнью. Я им тоже часто пишу. И, конечно же, описываю американскую «демократию». О том, как усиливается в этой стране милитаризм, обо всех демонстрациях и забастовках, о побоях, арестах, судах. О чем еще можно писать, когда кругом только и слышишь: там совершено насилие, там грабеж, там разные подлоги.

Вот 3 ноября прошли выборы в сенат, выборы новых губернаторов. Еще год назад началась самозванщина: кандидаты как от республиканцев, так и от демократов не жалели пышных слов... и денег. Израсходованы сотни миллионов долларов. За эти миллионы властолюбцы покупают себе правительственные должности. И все это оплачивает рабочий, у которого еженедельно с получки вычитают так называемый «инком такс» — «внутренний налог». Не говоря уже о налогах штатов, местных и т. д.

Но хуже всего то, что кандидаты в сенаторы, в губернаторы и т. п., как только приходят к власти, совершенно забывают о своих предвыборных обещаниях. Так было и теперь. Больше года длилась пропагандистская шумиха вокруг новых кандидатов. Республиканцы и демократы не щадили красок, когда разоблачали друг друга во лжи и подкупах избирателей. И у избирателей, в результате, нет выбора — все кандидаты куплены за миллионы долларов, всем им чужды интересы народа.

Сам президент Никсон перед выборами обещал многое: прекратить войну во Вьетнаме, ликвидировать безработицу, преступность, обеспечить порядок и спокойствие в городах, снизить налоги, обеспечить равноправие всех граждан и объединить всех в одну великую нацию, для всех обеспечить «просперити» — «процветание».

Слова, слова...

Война во Вьетнаме еще более расширилась, она перебросилась в Лаос и Камбоджу. Соединенные Штаты заявляют о своем миролюбии и тут же вооружают Израиль, Грецию. Не ожидая мирного решения конфликта, возникшего между арабским миром и Израилем, Вашингтон поспешил объявить, что США посылают Израилю 200 танков. А после этого решения президент в своей речи в Организации Объединенных Наций заявляет, что Америка проводит программу, направленную на достижение всеобщего мира. Вот тут и разберись: играют ли здесь «принципы мира» или, может, доллар играет принципами президента?..

Хочу сообщить вам, что у Марка Ефимовича в «Новом русском слове» случилось «несчастье» — преставился соратник Вейнбаума по черным делишкам небезызвестный Аргус. Что и говорить, незаменимый был шулер. Столько грязи он вылил на Советский Союз, на прогрессивные патриотические организации русских выходцев в Америке! Но великий мастер подлогов и клеветы Марк Ефимович не унывает. Он заполучил не менее «ценного» сотрудника — бывшего редактора журнала русских анархистов «Дело труда», который теперь подвизается в «Слове» под фамилией Ю. Полещук.

А в общем, в «Новом русском слове» все по-старому. По-прежнему вдохновенно сочиняются дифирамбы отщепенцам и предателям, обильными потоками льется словоблудие и лицемерие, с неустанным рвением Вейнбаум поднимает на щит «рыцарей сионизма».

Говорят, что Денис Горбацевич пишет дополнительную брошюру к изданной «Два месяца в гостях у колхозников» — «Как я два месяца на родине обманывал родных и друзей». Даже если бы и появилась такая брошюра, все равно Денису не смыть своего позорного клейма: ведь он не только оклеветал родных и друзей, но наплевал на святая святых — Отчизну.

А между прочим, у Горбацевича находятся последователи. Подстать ему оказался и его земляк со Случчины Трухан. Такой же беспринципный пустослов, страдающий манией «усовершенствования» Советского Союза. Трухан несколько лет назад посетил родину и через свои черные очки не увидел там ничего светлого. Я уверен, что его там принимали с открытой душой. А он — с сапогами в душу. Правильно говорят, как волка ни корми, все равно в лес смотрит.

Но, смею вас заверить, не одни труханы и горбацевичи посещают Советский Союз и создают о нем мнение здесь, в Америке. Все-таки в старой русской колонии гораздо больше порядочных людей. А им всегда было дорого чистое имя Родины.

Е. МАТЮШКОВ.

США.

ПРАВОСЛАВНАЯ ЦЕРКОВЬ В БЕЛОРУССИИ

В газете «Вестник» — органе Федерации русских канадцев — недавно была опубликована статья священника Минского кафедрального собора протоиерея Павла Кирика «Православная церковь в Белоруссии в прошлом и настоящем». Мы перепечатываем ту ее часть, которая касается нынешнего положения церкви в БССР, а также статью редактора «Вестника» Г. Окулевича.

ДВА ЧАСА У АРХИЕПИСКОПА АНТОНИЯ

Предлагаемая читателям статья протоиерея Минского кафедрального собора Павла Кирика была написана по нашей просьбе.

Будучи в прошлом году в Минске, знакомясь с жизнью города и проходя однажды мимо великолепного кафедрального собора, я выразил желание познакомиться с жизнью православной церкви в Белоруссии. Друзья из Товарищества по культурным связям с соотечественниками за рубежом предложили мне встретиться с главой православной церкви в Белоруссии архиепископом Антонием.

Архиепископ Антоний по телефону согласился меня принять в своем доме. В 4 часа пополудни я заехал по указанному адресу. Служащий священник встретил меня у калитки и провел в дом. Очень скромный бревенчатый домик архиепископа утопал в зелени — фруктовые деревья, кустарники, цветники. Усадьба обнесена деревянным забором, в сарайчике виднеется автомашина.

Я предполагал иметь краткий визит к владыке, визит вежливости. Архиепископ Антоний встретил меня очень любезно и пригласил в покои, в комнату-библиотеку, по стенам которой кругом сплошные полки с книгами. Да и во всем доме кажется больше всего места занимают книги. Священник, который встретил меня у калитки, вскоре подал черный крепкий кофе.

В начале нашей беседы я вкратце поведал, кто я, откуда, почему я в Минске, что меня интересует. В частности, я сказал, что в предыдущий день я посетил величественный незабываемый мемориал Белоруссии «Хатынь», созданный на вечную память по уничтоженным в Белоруссии гитлеровцами 136 деревням вместе со всеми их жителями. Эти 136 деревень не восстановлены и после войны — их не было кому восстанавливать. Этот мемориал производит столь потрясающее впечатление, что ни один человек, побывавший здесь, не будет таким, каким он был до посещения. Под этим впечатлением я рассказал владыке, что у нас в Канаде и в Соединенных Штатах почти все палачи белорусского народа маскируются набожностью, группируются в церквах. Некоторые стали священниками, как, например, Рыж-Рыгский. Это те, которые соучаствовали с немцами в уничтожении белорусского народа. Колокола Хатыни звучат не только в память погибших, звучат не только проклятьем палачам-гитлеровцам и предателям, но и зовут всех людей никогда не допустить того, что пережил белорусский и другие народы.

Изменники и палачи нашего народа пытаются взять на вооружение церковь. Выдавая себя за «набожных», они пытаются показать, что борются за «свободу религии», которая якобы попрана в Белоруссии.

Я сказал владыке, что хотел бы познакомиться сам и познакомить читателей «Вестника» с жизнью православной церкви в Белоруссии.

На эту тему у нас и велась беседа с архиепископом. Для меня она была одним из незабываемых эпизодов в моей поездке в Белоруссию. Архиепископ Антоний — необыкновенно интересный собеседник. Человек он высокий, крепкого телосложения, стройный, красивый, на вид несколько старше 50 лет, всесторонне образованный, окончил Московскую духовную академию, чрезвычайно эрудированный, владеющий несколькими языками, в том числе, английским. Часть беседы, по его предложению, велась (для «практики») на английском языке. Он часто бывает в составе делегаций Русской православной церкви на международных конференциях. В частности, в скором времени он намеревался выехать на церковную конференцию в Нью-Йорк.

Владыка сказал, что вполне естественно, что политические враги русского народа и советской системы употребляют и будут употреблять всякое оружие для борьбы против России. «Для привлечения простых людей в лагерь врагов Советской России и Белоруссии они искажают правду о религиозной жизни у нас, — сказал владыка. — Некоторые им верят по незнанию. У нас для этого есть единственное средство — говорить и писать правду. Только правду, как у нас есть на самом деле».

Мою просьбу написать статью о жизни православной церкви в Белоруссии владыка вначале согласился выполнить, но тут же внес поправку. «У нас есть священник, который все время жил и работал здесь, его все в Белоруссии знают и уважают. Очень многие из тех, что находятся за границей, знают его. Это — протоиерей Кирик. Он прекрасно знает и прошлое, и настоящее православной церкви в Белоруссии. Я передам ему вашу просьбу и надеюсь, что он ее выполнит».

Время беседы пролетело быстро, я пробыл у владыки около двух часов. Ему пришло время ехать на вечернее богослужение в собор. На прощанье владыка подарил мне интересную граммофонную пластинку «Ростовские звоны» и несколько книг.

Мне было по пути, и владыка предложил подвезти меня к собору. Я зашел в собор и видел торжественное богослужение архиепископа. Это был будний день, в соборе было около сотни мужчин и женщин. Больше женщин, чем мужчин, большинство пожилые и старики, но были и молодые. Внутреннее убранство собора прекрасное.

Прошел некоторый срок, и мы получили статью протоиерея Кирика. Она действительно очень интересна, написана с глубоким знанием истории православной церкви в Белоруссии и ее жизни в настоящее время. Мы ее предлагаем вниманию читателей. **Г. ОКУЛЕВИЧ.**

ВЕРУЮЩИЕ И НЕВЕРУЮЩИЕ РАВНЫ ПЕРЕД ЗАКОНОМ

В зарубежной печати, в выступлениях отдельных лиц, часто, особенно в последнее время, поднимается вопрос о положении церкви в Белоруссии, причем положение это, как правило, освещается неверно. Говорится, например, о существующем, якобы, у нас стеснении в отправлении религиозных обрядов и богослужений, иногда прямо говорится «о преследовании религии» как вообще в Советском Союзе, так, в частности, и в Белоруссии. Настоящей статьей нам хочется внести ясность в этот вопрос, показать, как у нас в Белоруссии протекает религиозная жизнь в данное время.

Прежде всего надо сказать, что у нас в Советском Союзе, а значит и в Белоруссии, религия, по Конституции, является сугубо частным делом. У нас каждый волен исповедывать любую религию или не исповедывать никакой. Никакого принуждения к исполнению тех или иных обрядов быть не может, так же, как не может быть и никаких препятствий верующим в удовлетворении их религиозных нужд и потребностей. Вспомним, что примерно так же было и в начале христианской истории. Для церкви это благо, так как от нее отошли все, кто считался православным только формально, в церковной же ограде остались только верующие. Верующие и неверующие у нас совершенно равны пред законом, что гарантировано Конституцией, по которой церковь в Советском Союзе отделена от государства. Храмы наши отремонтированы, сияют чистотой, а имеющие историческую или художественную ценность взяты под охрану государства. Всей материальной стороной жизни общины ведают избранные из среды самих верующих лица, так что духовенство освобождено от всяких забот по ремонту и поддержанию в порядке церковных зданий и может полностью заняться своей прямой обязанностью — совершать богослужения, требы, проповедывать и вообще вести верующих ко спасению. Таковы в общих чертах правовые и фактические основы церковной жизни в Советском Союзе и в Белоруссии.

В Белоруссии имеется много просвещенных пастырей, так как здешняя Минская семинария, помещавшаяся в Жировичском монастыре, сумела воспитать хорошую смену престарелым священнослужителям.

В настоящее время архиепископом Минским и Белорусским является Антоний, магистр богословия. В свободное от дел по управлению своей обширной епархией время архиепископ Антоний посещает большие и малые города Белоруссии, совершая богослужения, поучая и благословляя верующих. Так, в этом году он посетил Могилев, Гомель, Витебск и районные города этих областей.

Теперь необходимо сказать несколько слов о наших белорусских святынях и о религиозной жизни белорусов.

Главная святыня Белоруссии — Жировичская обитель — за последние годы приведена в цветущее состояние, в каком она никогда прежде не была. Все пять храмов монастыря заново капитально отремонтированы, храмы расписаны внутри и снаружи. В Успенском соборе установлен металлический вызолоченный престол, дар святейшего Патриарха Алексия, работы патриаршей мастерской. В этом году Жировичский монастырь отпраздновал 500-летие со дня явления Жировичской чудотворной иконы божией матери и основания монастыря. В праздник обретения чудотворного образа, 7-го мая по старому стилю, верующие белорусы, как и в древние дни, в большом числе пришли сюда для молитвы и духовного утешения. В этот день владыка архиепископ совершил торжественное богослужение, в котором приняли участие и многие из духовенства Белоруссии.

Минский кафедральный собор, памятник архитектуры XVII века, был построен как униатский храм более 350 лет тому назад. Также и собор за последние годы приведен в прекрасное состояние, внутри выкрашен белой масляной краской, пол настлан кафельной плиткой очень красивого рисунка. Сравнительно недавно в соборе установлен металлический вызолоченный престол, также работы патриаршей мастерской. Главной святыней собора является чудотворная икона божией матери на реке Свислочь. Каждое воскресенье вечером пред чудотворной иконой служится акафист, который поет весь народ. После акафиста обязательно очередной священник произносит поучение.

В соборе введено общее пение.

В Белоруссии, быть может, как нигде, чтят память «прежде отшедших отец и братий», т. е. своих дорогих покойников. Во все установленные православной церковью четыре родительские субботы совершается торжественное поминовение усопших, из коих особенно почитается Димитриевская родительская суббота, носящая в Белоруссии народное название «Деды». В этот день, после богослужения, верующие идут на кладбище, где на могилах своих умерших зажигают свечи и в честь их совершают поминальную трапезу. Тогда же совершается и

Жировичский монастырь.

поминовение всех воинов, павших в минувшую Отечественную войну. Могилы воинов, отдавших свою жизнь за освобождение Белоруссии, всегда содержатся в полнейшем порядке, их украшают цветами и зеленью, сюда приходят поплакать те матери и вдовы, сыновья и мужья которых похоронены во многих странах Европы, которые они освобождали.

Подводя итог сказанному, можно констатировать, что религиозная жизнь у нас в Белоруссии протекает вполне нормально, в трогательном единении между архипастырем и паствой, в спокойствии и мире.

С самого начала возникновения борьбы за мир во всем мире церковь в этом святом и благородном деле принимает самое активное участие. Голос ее мощно звучит на всех всесоюзных и международных совещаниях, и к этому голосу не могут не прислушиваться и те, кому мир не дорог. Что меч, занесенный над головой человечества, еще не опустился, что его удерживает мощная рука сторонников мира, — в этом, несомненно, есть и заслуга православной церкви. И не только за мир во всем мире борется православная церковь, она, вместе со всем русским народом, борется также и против всякой несправедливости на земле, борется за свободу угнетенных и порабощенных еще народов. Мы, верующие белорусы, радуемся, что наш Архиепископ Минский и Белорусский Антоний является частым участником международных съездов и конференций, выступая на них с содержательными докладами и внося конструктивные предложения по обеспечению мира. И мы верим, что усилия всех лучших людей во всем мире, наших вождей и руководителей, представителей нашей родной Русской православной церкви принесут свои плоды, и мир во всем мире будет сохранен.

Протоиерей Павел КИРИК,
священник Минского кафедрального собора.

(For the beginning see issues Nos. 37—47).

She did not answer but readily put her arms round his neck and pressed close to him; immediately he felt warmer.

«Ivan», she said softly through the wind, breathing warmth into his ear, «Ivan, you *wunderbar!*»

«I'm not wonderful at all!»

She was beginning to feel quite comfortable on his back and felt, too, that he did not dislike her; this made her bolder.

«Russo all *wunderbar*, eh?»

«Yes, yes», he agreed since he was not used to talking about himself; furthermore, he thought the path would at any moment bring them to a gentle slope and he wanted to get past the steep part as quickly as possible.

«Ivan want frighten Giulia, yes? Ivan wouldn't leave Giulia, yes?»

He laughed, embarrassed in the darkness and spoke with an assurance he would have liked to believe.

«Of course not...».

«Little heavy, eh?...».

«Oh no, like a bit of fluff».

«What that — fluff?»

«Fluff. Little feather».

«Tiny little one?»

«Yes».

The path they were following stood out clearly in the fresh snow. He was amused at the way the girl's breath tickled the back of his neck. Her thin fingers suddenly stroked his chest and he shuddered at that unexpected tenderness.

«You teach me speak your language?»

«Byelorussian?»

«Yes».

He laughed, it seemed that no question could have been more out of place under the circumstances.

«Of course I will. When we get to Trieste we'll begin».

The very idea aroused in him a number of unusually pleasant feelings. Would they really be lucky enough to get as far as Trieste and find the partisans? If they did they would never part company again on any account, they would join the same column. How important it was in a strange country to have a loved one by one's side! Ivan could feel her tender affection for him and her presence was no longer unwanted or burdensome. It was only now that he had spent two whole days with her that he realised how lonely he had been all those war years — comradeship in the army was something quite different. The interest and warmth she displayed had something sisterly or even motherly about it and there was no need for any particular word, her silent proximity filled him with quiet joy.

They entered the saddle with the steep slopes of the two peaks rising above them on either side — the path zigzagged between them a little way and then obviously began to go downhill. The snow continued slowly falling in the darkness.

«Pass?» Giulia fluttered like a bird on his back.

«Yes, it's the pass».

«Oh Madonna!»

«And you wanted to give up! You see, we've got here!»

He stopped, stooped down to make her more comfortable but she dragged herself away from him.

«Giulia go herself. *Danke, grazie,* thanks».

He did not let go of her legs and the girl had to put her arms round his neck again so as not to fall. She sat with her cheek against his chilly shoulder and with a laugh ran her fingers round his unshaven chin.

«Oh, Ivan, you like *riccio*[1]».

«I'll shave in Trieste».

«Trieste! Trieste! In Trieste partisans. Ivan and Giulia — bang, bang bang *tedeschi*. Fascist bastards!»

He listened to her chatter with a restrained smile as he carefully felt his way in the darkness. Downhill was much easier than uphill, but the clogs kept slipping and his knees were beginning to ache from the constant strain; breathing, however, had become easier. There was a constant risk of falling, and it was a tremendous effort for Ivan to keep on his feet as he hurried downhill, at times with short, quick steps, at others actually running.

«Oh, oh, Ivan...». Several times Giulia let out little screams from behind him.

«There's nothing to worry about — hold tight!»

The wind had by now died down and that made it seem warmer. They could not see where the path was leading them or what awaited them at the end of it.

After a time the wind almost ceased, the snow also stopped, and on all sides, as far as they could see, there were piled-up, snow-covered rocks. The path twisted right and left making fantastic turns on the rocky slope which was not so steep on this side as that on the other side of the pass. Ivan was very tired and he walked on steadily without looking round, doing his best to keep to the path. Giulia, for some reason had stopped talking. Once he tried to talk to her but the girl did not answer and he guessed why — she was asleep.

She had dozed off without realising it as she hung on his back and was breathing heavily but regularly, her hands lying soft and gentle on his shoulders. The jacket had apparently opened up and he could feel the warmth of her breasts on his sharp shoulder blades. As though out of spite a pebble got into one of his clogs and a couple of times he tried to kick it out without bending down. Walking was difficult on account of it, but he did not want to wake the girl and kept walking slowly, thinking he had been going downhill for a long time. He was dozing as he walked and did not know where he was or whom he had on his back. Actually the spell only lasted a few brief seconds, then he was fully awake again, could feel her breath and felt more at ease. Gloomy cliffs with patches of melting snow still surrounded them, but soon he felt dampness in the air that came from down below bringing with it the resinous smell of a conifer forest, and from somewhere, far away came the noise of a waterfall. There was probably a narrow canyon over there.

By morning he reached a brassy slope.

The patches of snow suddenly disappeared as though they had melted; the wind had died down, it had become warmer although the air was more humid, and wisps of dawp mist came crawling up from the valley across the rocks. Lower down an aroma of grass, flowers and conifers filled the air and Ivan realised that the worst was already behind them. The path had disappeared but the going was easy and he did not look for it. After a short while there was thick, soft grass underfoot and he felt he might fall at any moment. The tall stems of some flowers with hard buds on them lashed at his legs. Giulia was sleeping calmly. In order not to wake her, he knelt down and then lay himself slowly down on his side.

Giulia did not wake up.

[1] Hedgehog *(It.)—Tr.*

14 This time the usual alarming dream did not haunt him. He lay wrapped in deep untrammelled sleep for several hours and then a phantom mixture of delirium and reality filled his mind.

At twenty-five, youth is rapidly departing, many simple human joys will never return or ever be experienced if they have not been already and for this reason people reserve a better fate than the one in store for Ivan Tereshka. It is true the young man himself rarely gave the matter any thought, he was no seeker after happiness; at home he had had to worry about how to live, how to stand on his own feet. Later, during the war, he naturally had still more important things to worry about. There had never been time for love. He knew nothinb about women and, as is often the case with young people, he was sceptical about relationships between boys and girls.

A couple of years before Ivan and his company commander, Senior Lieutenant Gleboy, had been wounded at the same time on the Northwestern Front, where Ivan had been the commander's orderly.

They were wounded in a forest when the commander was on his way to a conference called by the regimental commander. Ivan's shoulder was slashed by a shell splinter, but he carried the officer out of range of enemy fire and stayed with him till they were picked up by a transport column. Ivan's wound was not serious, he felt fairly well, but Gleboy was in a worse condition. He had lost a lot of blood, his face was as white as a sheet, he said little but asked to be sent immediately to the base hospital without going through the field hospital. The orderly knew what was troubling his commander—Gleboy did not want to upset Anyuta, a tall, slim girl with big, bright eyes, a former medical orderly

in their company who had been promoted to nurse at the fild hospital. Everybody in the company knew that she and Gleboy were not just amusing themselves, that their love was real, that was why Gleboy had only the day before had her transferred to the field hospital which was not quite as dangerous as the front-line trenches. The soldiers in their company also loved the girl in their own way—they respected their commander and they respected his love. The orderly, Ivan, had his owa special attitude towards her—probably because he knew Gleboy better than the others he treated Anyuta as he would his young sister, and perhaps as something more.

It so happend that Gleboy could not bypass the field hospital. How could Ivan think of taking him to base when he was not sure that he would get him to the field hospital alive? They were picked up by a horse sleigh which moved swiftly along, the hard snow of the road and Ivan shouted at the driver, an elderly, slow-moving soldier who wore two greatcoats over his quilted jacket, to drive faster. Gleboy began to lose consciousness, he became delirious, he cursed, did not recognise his orderly or even Anyuta, who fell on the sleigh with a scream when they at last reached the big tent of the field hospital.

Ivan would never forget that evening, the frosty starlit sky, the gloomy firs, the customary smell of smoke, the soft voices of the men in the ward, and, most of all, Anyuta's inconsolable grief. They would not allow her in the operation tent, so with a sheepskin coat thrown over her shoulders, she stood outside and cried. Ivan also sat near the door and, forgetting his own pain, got every word he could about the commander's condition from the nurses who went in and out. The news was not of the best, the operation was a long and difficult one, they had given him transfusions of blood and saline solution.

Ivan waited for a long time, did not try to console Anyuta for he was deeply troubled himself—he just smoked and smoked until his tobacco pouch was empty.

Gleboy died during the operation, the surgeon did not even have time to stitch up the wound.

The sudden sorrow seemed to destroy something in Ivan's soul; he would never have believed that Gleboy's death would upset him so much. It seemed that his own sorrow was made greater by the sight of another's grief. For several days Anyuta did not turn up for duty at the hospital and nobody blamed her for it; the wounded who lay on stretchers in the big marquee that served as a ward showed great respect for her sorrow. It was then that Ivan first realised that he had some special feeling for her—it was not love, it was a feeling that was more like gratitude for her loyalty to the company commander, respect, nothing more.

During the long winter evenings in the field hospital he seemed to have forgotten how to laugh and joke; all he did was smoke endless home-made cigarettes from the raw tobacco called *makhorka* and stare at the glowing wood stove made from an oil barrel that Medical Orderly Akhmetshin kept red hot. He hardly spoke to Anyuta after that terrible evening and they understood each other well enough without words. When she returned to duty a short time later she had lost her former vivacity and had become contemplative and strict beyond her years. Their common sorrow brought them closer together. Ivan did odd jobs to help her in the ward but never said a word about what they had gone through and she was grateful to him for it.

Ivan's wound soon began to heal and he was able to go out with his arm in a sling; he and Akhmetshin wandered along the forest verge to a war-ruined village where there was a huge German cemetery the nazis had left behind when they retreated the year before. Hundreds, maybe even thousands, of crosses stood in lines over an area of more than ten hectares — whichever way you looked at them, lengthwise, crosswise, or along a diagonal, the lines were always straight as though on parade. The young men knew from the labels on the crosses that the dead invaders had been born at various times and places; but they had all died together in the same year.

Late in the evening, when Anyuta had finished her work, she would often sit beside Ivan on a stretcher and gaze into the fire with him; at such times there was always someone in a dark corner telling some exciting war story or relating something pleasanter from the prewar past. And that made them feel good.

As time passed the wounded in the field hospital left, some were well enough to return to their units, others were evacuated deeper into the country. One day the peaceful calm of the ward was disturbed by a change that at first sight seemed very slight.

After dinner, when Ivan was collecting the dirty mess tins to take them to the cookhouse, voices could be heard at the tent door and two orderlies carried a wounded man in on a stretcher covered with a sheepskin coat; he turned out to be a young officer wearing the insignia of a major (it was later discovered that he was from a tank unit operating in support of their division). He was put into a comfortable corner, and the commissar of the medical battalion began fussing round him.

(To be continued)

ПАЗЫЎНЫЯ Ў ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ НІЧЫПАРА ЧАРНУШЭВІЧА

Было гэта ў лютым 1963 года. Яшчэ зранку завітала да мяне адна мясцовая паэтка. Доўга гутарылі, а потым я папрасіў яе звярнуць увагу на карціну мастака Барыса Святліцкага, якая вісела на сцяне. Яна зірнула на карціну і спытала:

— А што тут намалявана?

Я растлумачыў, што сродкамі жывапісу мастак імкнуўся перадаць на палатне не толькі сваё замілаванне «Анітрай» Грыга, але і гучанне самой мелодыі.

Паэтка выслухала мой каментарый, пагардліва перасмыкнула плячыма і сказала:

— Дарэмная трата часу. І вось чаму...

Толькі пачала выказваць свае меркаванні, як на парозе з'явіўся нечаканы госць.

— Я да вас з Беларусі.

— Нічыпар Фёдаравіч!.. Якая радасць!..

Да гэтага часу я ніколі не сустракаўся з паэтам Чарнушэвічам. Але рысы яго аблічча былі такімі адметнымі, што варта было раз убачыць яго фота, як яны запаміналіся назаўсёды.

Госць паставіў на стол скрынку і асцярожна распакаваў дзве фарфоравыя вазы з партрэтамі Купалы і Коласа.

— Вам ад брата Міколы і ад мяне. На памяць аб радзіме.

Тут яго позірк выпадкова трапіў на карціну Святліцкага і затрымаўся.

— Гэта музычная тэма... І як выразна гучыць, — сказаў Нічыпар Фёдаравіч.

— А для мяне не гучыць, — запярэчыла мая знаёмая. — І наогул, я не разумею, як можна гукі перадаць фарбамі... Такія спробы пярэчаць самой прыродзе і з'яў, і мастацтва.

— Вы, як я зразумеў, адмаўляеце мастаку ў праве на пошукі і эксперыменты, — спакойна сказаў Нічыпар Фёдаравіч.

— Я за разумныя пошукі, — удакладніла паэтка.

— Імкненне да пошукаў — гэта ўжо разумна, — адказаў Нічыпар Фёдаравіч.

Наша размова заняла некалькі гадзін. З прыемным здзіўленнем мы даведаліся, якім пасучаснаму дасведчаным чалавекам быў паэт. З захапленнем ён гаварыў, што наспеў час з'явіцца новым відам мастацтва, гаварыў пра аднаўленне традыцыйных відаў, пра магчымасць іх сінтэзу і ўзаемапранікнення. Марыў аб перадачы ў касмічнай прасторы фестываляў каляровай музыкі, экранам для якіх было б само неба, каб чула і бачыла іх усё чалавецтва, а магчыма, і інапланяцяне.

...У пачатку 1928 года выкладчык роднай мовы і літаратуры Чашніцкай школы калгаснай моладзі Хвядос Іваноў прынёс на заняткі школьнага літаратурнага гуртка новую ў сіняй вокладцы кніжачку з незвычайнай назвай «Дзіва». На вокладцы малюнак — высачэзная гара, а ўнізе перад ёй — маленькая постаць чалавека з ускінутай рукой. Туды, наверх!

Гэта была першая кніга Нічыпара Чарнушэвіча. Тады мы, літгурткоўцы, і пазнаёміліся з вершам паэта «Аэліта».

«Дык вось адкуль бярэ пачатак касмічная настройка дум і пачуццяў майго госця!—падумаў я.—Яшчэ з тых часоў, калі паэт з поўным правам мог сказаць:

Дальніх зор над чалом
Беларусі лапцюжнай,
Беларусі лапцюжнай
Я пазнаў хараство...»

Прыгадваю госцю яго даўнюю «Аэліту».

— Над чалом Беларусі лапцюжнай, — на поўныя грудзі ўздыхае Нічыпар Фёдаравіч.— А зараз Краіна Саветаў пачынае касмічную пару чалавецтва... Як гэта радасна!

Нічыпар Фёдаравіч лячыўся ў адным з санаторыяў у Пяцігорску, наведаў мяне яшчэ два разы, і ўсё роўна наша гутарка не спынялася ні на хвіліну.

На развітанне ён пакінуў у падарунак сваю кнігу «Нясу надзею» і спадзяваўся не раз прыехаць да нас...

«Нясу надзею» (1962) і «Гаворка дум» (1966) — яшчэ два зборнікі вершаў, якія выйшлі пры жыцці паэта. Малады, ён пісаў:

Сёння іскра — заўтра
полымя,
Не тушы яе, мой любы.
Хай не вераць яшчэ людзі!
Сёння іскра — заўтра
полымя.

Не будзем гадаць, якое паэтычнае полымя шуганула б з яго няздзейсненых задум, ненапісаных кніг. Праглядаючы тое, што ёсць, мы ясна бачым, што было яго жыццёвым і творчым напрамкам.

Можа не раз давядзецца
і ўпасці,
І ў паратунак не знойдзецца
веры
Можа не раз і шалёныя
ветры
Свет мне запыляць і шлях
занапасцяць.

Толькі растрэсці не дам
і з напарста:
Дум яснавокіх, спадзеванак
светлых:
Заўтра не будзе для радасці
пастак
Вольна ёй, добра
ў заўтрашнім свеце.
З гэтай надзеяй не шкода
і ўпасці.

Гэтыя радкі мог напісаць чалавек, які шмат перажыў і пабачыў, многае ўзважыў і перадумаў.

Добра
Хвалу гучным датам аддаць,
Лепш
Пазыўнымі ў дзень заўтрашні
стаць,—

сказаў паэт у апошнім зборніку. Да гэтага ён і імкнуўся.

Вісарыён ГАРБУК.

Пяцігорск.

ЗАЙГРАЙЦЕ, МУЗЫКІ!

Калі сонца здаволіцца за дзень хадзіць па палях-лугах, калі шызыя гурты хмарак вецер пагоніць за лес на начлег, а вясковыя дзяўчаты і хлопцы памяняюць рабочыя касцюмы на святочныя, над вёскаю Барава ўзлятае звонакрылая песня:

Заіграйце, музыкі —
настае дзень вялікі,
Хай багаццем накрыецца
стол,
Хай працоўнае свята
ўвойдзе ў кожную хату,
Хай жа песні звіняць
навакол.

Гэта бараўская моладзь спявае за вёскай. Кажуць, непадалёку адсюль калісьці і ўзнікла вёска, каб быць сведкам спаткання прыгажуна Нёмана і светлавокай ракі Бярэзіны, якую мясцовыя жыхары называюць Бярозай. Нёман тут выгнуўся, нібы жадаючы скараціць сваёй сяброўцы шлях. А яна, ціхмяная, праз лясы і бары настойліва прарэзалася сваёй срэбнай стужкай да яго, каб назаўсёды зліцца ў абдымках.

У вайну Бяроза з Нёманам у гэтым месцы служылі надзейным заслонам народным мсціўцам ад немцаў. Кіраўнік хору, былы партызан Віктар Шарэцкі расказвае, што фашысты баяліся паказваць нос не толькі ў Бараўскі лес, а нават і ў навакольныя вёскі.

Невыпадкова тыя трывожныя дні знайшлі сваё адлюстраванне ў рэпертуары хору. Гэта песні І. Кузняцова «Партызанскі край», Ул. Алоўнікава «Лясная песня» і «Песня пра Заслонава» і іншыя. Самае ж значнае месца ў праграме хору адводзіцца творам аб Радзіме, аб сённяшнім Прынямонні.

Як у нас на Нёмане
Самы светлы май.
Над усёй старонкаю
Льюцца песні звонкія...

Слухаюць песню ў вячэрняй цішыні Нёман і Бяроза, слухае задуменны бор на тым беразе — успамінаюць... Магчыма, ім прыгадалася старое Барава і гаротная, тужлівая, як тагачаснае жыццё, песня нёманскага плытагона. А, магчыма, яны ўспомнілі векапомны верасень трыццаць дзевятага года, калі жыццё нараджала новыя песні. А, магчыма, ім з прыемнасцю ўспамінаецца гарачае лета 51-га года, касавіца і... першая песня.

Віктар Шарэцкі тады выпадкова ішоў паблізу. Ішоў ды так і застыў на сцежцы. «Да чаго галасістыя кабеты», — зазначыў сам сабе аматар песні і падышоў бліжэй да калгасніц.

— Жанкі, а што калі мы збяромся вечарам у вашым клубе ды са сцэны паспрабуем?

— А сцэна тая вытрымае, калі мы ўсе прыйдзем? — жартавалі жанчыны.

— Наша сцэна — сенажаць, — басам сказаў нехта з касцоў і, быццам касой, перарэзаў далейшую размову.

— А ўсё ж прыходзьце,— няўпэўнена закончыў сваё першае знаёмства з бараўцамі Віктар Канстанцінавіч.

Вечарам у клуб прыйшлі многія з тых дзяўчат, што спявалі на лузе, а для смеласці — з імі некалькі хлопцаў. Назаўтра жадаючых «запісацца» прыйшло яшчэ больш. А да канца тыдня ўжо і цеснавата стала.

Маладому калектыву Віктар Шарэцкі аддаваў увесь запал душы, веды і вопыт, усё, чаму навучыўся сам у лепшай тады харавой капэле калгаса «Сцяг Саветаў» на Навагрудчыне.

Першую заяўку аб сабе хор зрабіў зімой 1951 года ў Юрацішках, куды за 35 кіламетраў яго ўдзельнікі дабраліся на санях. Тады ж, у першы год свайго існавання, хор калгаса «Зара» трапіў на абласны агляд мастацкай самадзейнасці і вярнуўся з дыпломам першай ступені. З таго часу бараўцы — пастаянныя ўдзельнікі ўсіх аглядаў і конкурсаў.

У 1957 годзе яны прымаюць удзел у рэспубліканскім фестывалі моладзі і студэнтаў. За яркае і каларытнае выкананне песень хору быў прысуджан дыплом другой ступені.

З году ў год расла папулярнасць хору. У 1959 годзе яго зноў запрашаюць у Мінск на калгасна-саўгасную дэкаду самадзейнага мастацтва. Аб паспяховым выступленні на гэтай дэкадзе сведчыць Грамата Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Усё ж самай значнай вяхой у жыцці хору быў 1965 год. Тады на Трэцяй дэкадзе беларускага мастацтва за самабытнае і глыбока народнае выступленне яму было прысвоена званне народнага.

Амаль дваццацігадовы шлях народнага хору нельга было б уявіць без яго старэйшых удзельнікаў: лесніка, былога партызана Дзмітрыя Волікава, шафёра Івана Карповіча, калгаснікаў Міхаіла Папроцкага, Івана Хамы і многіх іншых.

— Няхай хоць каменне з неба падае, — кажа Віктар Канстанцінавіч, — а гэтыя людзі ўсё роўна не прапусцяць рэпетыцый.

Таму што іх кіраўнік Віктар Канстанцінавіч сам гатоў ісці па песню хоць на край свету. Ён тры гады хадзіў за сем кіламетраў на той бок Нёмана ў капэлу калгаса «Сцяг Саветаў», хоць і многа было клопату тут з маладым калектывам. Усё гэта ён спалучаў з працай у школе і завочнай вучобай у Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы, бо лепшы бас капэлы і выкладчык спеваў дагэтуль быў самавучка.

Нядаўна на абласным аглядзе харавых калектываў у выкананні бараўцаў узнёсла прагучала песня П. Шыдлоўскага «Заіграйце, музыкі».

Край, пра які спяваюць бараўцы, узнімаўся з руін і попелу на іх вачах і іх рукамі. Песня дапамагала ў працы, а праца — давала жыццё новым песням. Яны спадарожнічалі ўсюды працаўнікам калгаса «Зара». Ідзе летам палоць лён салістка хору Анатоля Матылевіч і спявае. У абедзены перапынак да Анатолі падыходзяць сяброўкі, падхопліваюць, і тады поле слухае песню:

Валакністы, шаўкавісты,
Чысты, чысты лён...

Муж Ільнаводкі Сцяпан Матылевіч працуе электрыкам у калгасе і таксама ходзіць у хор.

— У гэтым хоры, — гаворыць ён, — мы з самага пачатку. Ужо гадоў мусіць 19—20 спяваем. Праўда, спявалі мы і раней, але так, для сябе. А потым, як прыехаў да нас кіраўнік Віктар Канстанцінавіч, сабраў хор, і з таго часу мы — пастаянныя яго ўдзельнікі. Вядома, усё гэта не так проста — хата, гаспадарка, дзеці, але ўсё-такі знаходзім час, каб заўсёды прыйсці ў клуб. Прывыклі і ўжо неяк не ўяўляем сваё жыццё, адпачынак без песні.

А. ДЗЕМІДОВІЧ.

Іўеўскі раён.

Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут адзначыў сваё 25-годдзе. Сюды прыходзяць юнакі і дзяўчаты, якія любяць мастацтва, збіраюцца стаць артыстамі, рэжысёрамі. Зараз у сценах інстытута вучыцца 550 чалавек па 22 спецыяльнасцях. НА ЗДЫМКАХ (уверсе): студэнты акцёрскага факультэта Віктар МІХАЙЛАЎ, Святлана ПЕНКІНА, Алена ПАСТРЭВІЧ і Уладзімір КОРПУСЬ; другі здымак зроблен у выставачнай зале інстытута, дзе зараз экспануецца звыш 300 работ студэнтаў.

Фота Я. КОСЦІНА.

НА ПРЫЗ АЛЯКСАНДРА МЯДЗВЕДЗЯ

Яго называюць каралём дывана, з яго бяруць прыклад. Дакладней, спрабуюць браць прыклад, таму што быць такім, як ён, цяжка. Амаль дзесяць год ён «крочыў» па барцоўскіх дыванах свету, не ведаючы паражэнняў. Восем разоў ён станавіўся чэмпіёнам Савецкага Саюза, шэсць разоў прывозіў на Радзіму залатыя медалі чэмпіёна свету, двойчы — чэмпіёна Еўропы, удзельнічаў у дзвюх Алімпіядах і абодва разы не ведаў сабе роўных. Спартыўны подзвіг беларускага барца — заслужанага майстра спорту, кавалера ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Аляксандра Мядзведзя — бясспрыкладны.

Камітэт па фізкультуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР і рэспубліканская Федэрацыя барацьбы выравылі правесці ў Мінску міжнародны турнір па вольнай барацьбе на прыз заслужанага майстра спорту А. Мядзведзя.

У спаборніцтвах прынялі ўдзел барцы Балгарыі, ГДР, Польшчы, Румыніі і Савецкага Саюза. У чатырох вагавых катэгорыях — першай сярэдняй, другой сярэдняй, паўцяжкай і цяжкай вазе — выступілі 27 спартсменаў.

Ганаровым галоўным суддзёй турніра быў назначаны Аляксандр Мядзведзь.

Пераможцам у першай сярэдняй вазе і ўладальнікам прыза Аляксандра Мядзведзя стаў спартсмен з ГДР чэмпіён Еўропы Хорст Штотмайстар. У астатніх вагавых катэгорыях прызы Аляксандра Мядзведзя атрымалі мінскія барцы Пётр Фіясь, Сямён Лісафін і Леанід Котаў.

НА ЗДЫМКУ: сустрэча румынскага барца І. ДУМІТРУ з савецкім спартсменам М. АКСЁНАВЫМ.

ДЗЕ РАСТУЦЬ ФУТРЫ

Спрадвеку модніцы ўсяго свету не былі раўнадушнымі да лёгкай і прыгожай футры. І паляўнічыя стараліся. Ды так, што каштоўных звяркоў станавілася ўсё менш і менш. Урэшце рэшт некаторыя з іх зусім звяліся б, каб людзі не навучыліся вырошчваць іх у няволі.

...Сярод хвойнай зеляніны ў баку ад шумнай дарогі раскінуўся ў лясной цішы незвычайны гарадок. І пасяліліся ў ім некалькі тысяч жыхароў. Да спадобы прыйшоўся мяккі клімат Магілёўшчыны ўраджэнцу суровай тундры — пясцу. Па суседству ўладкавалася норка. Пабудавалі ім людзі прыгожыя шэды — свайго роду звярыныя інтэрнаты. Даюць ім і мяса, і рыбу, і вітамінныя кармы.

Пагадзіліся звяркі з такім жыццём, прыстасаваліся да новых умоў. Нават пачалі забываць свае інстынктыўныя звычкі.

Галоўны заатэхнік звераганаспадаркі С. Нейман расказаў пра прыгоды адной норкі, якой удалося ўцячы ў лес. Тры дні шукалі бяглянку, але не знайшлі. І яна не змагла пражыць без людзей, бо паляваць на птушак, меншых звяркоў ці самой лавіць рыбу ёй ад нараджэння не даводзілася. Не дапамог і інстынкт. Аказаўся звярок не прыстасаваным да самастойнага жыцця ў лесе. І вярнуўся сам да людзей, на звераферму, дзе ён прывык да апетытнага вітамінізаванага мяснога фаршу.

Быў і такі выпадак. Кармацэх выйшаў са строю, і нельга было рыхтаваць фарш. Вырашылі даць на вячэру звяркам па кавалачку мяса. І што вы думаеце? Спрадвечныя драпежнікі не ведалі, што рабіць з мясам: гулялі з ім, забаўляліся, але не елі — прывыклі да прыгатаванай ежы.

Усё гэта цікава. Звераводы любяць сваю справу, і ім ёсць што расказаць пра сваіх выхаванцаў. Але ж Магілёўская звераганаспадарка — прамысловае прадпрыемства. А фінансавы план — гэта грошы. У мінулым годзе было атрымана 100 тысяч рублёў чыстага прыбытку.

Звераводы будуюць новыя цэхі, шэды, расшыраюць асноўны статак пясцоў да 2 тысяч, а норкі — да 3 тысяч галоў. У далейшым племяннное пагалоўе норкі ўзрасце да 5 тысяч.

Да апошняга часу разводзілі тут і чарнабурых лісіц. Але прайшла мода на лісіныя каўняры, і лісіц прыйшлося «скараціць».

Сёлета магілёўскія звераводы дадуць краіне тысячы шкурак пясца і норкі. Лепшыя з іх зазвоняць золатам на Ленінградскім і замежных міжнародных аўкцыёнах. А колькім дзяўчатам і жанчынам даставяць радасць новыя паліто з норкавай аддзелкай!

І. ДАБРАНСКІ.

ВЯСЕЛЛІ НА ПАЛЕССІ

Славіцца восень на Палессі добрымі ўраджаямі. А яшчэ тым, што ў прыбужскіх вёсках спрадвеку многа вяселляў. Калі ў нашым Чэрскім сельскім клубе ідзе ўрачыстая рэгістрацыя шлюбу, уся вёска сходзіцца сюды. Маладыя пад'язджаюць ва ўпрыгожанай кветкамі машыне. Ля ганку па старой добрай традыцыі ім падносяць хлеб-соль на вышытым ручніку. Заліваецца гармонік, пеніцца ў бакалах шампанскае, гучаць сардэчныя словы старшыні сельсавета, маладыя дораць цукеркі дзецям, кружацца ў танцы пары...

На начасце і радасць злучылі сёлета свой лёс настаўніца Людміла Якубоўская і служачы Аляксандр Сцепанюк, загадчыца сельскім клубам Марыя Карнялюк і механік сайгаса «Дамачэўскі» Васіль Любчык, тэлефаністка Марыя Бурак і шафёр Віктар Суткоўскі... А напярэдадні яшчэ нямала радасных вяселляў.

В. АСНЮК.

Брэсцкі раён.

«АНКЕТА—70»

Падыходзіць к канцу знамянальны 1970-ы год. Што дае права называць яго такім! Якімі выдатнымі падзеямі быў ён адзначаны!

У 1970 годзе чалавецтва адзначыла 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, найвялікшага рэвалюцыянера і стваральніка Камуністычнай партыі і нашай Савецкай дзяржавы.

У гэтым жа годзе споўнілася чвэрць стагоддзя з дня перамогі савецкага народа і яго саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі над фашысцкай Германіяй.

Зразумела, што людзі ўсёй планеты, праводзячы год 1970-ы, з поўным правам назавуць яго годам вялікіх касмічных перамог, дасягнутых Савецкай краінай.

Год, які адкрыў новае дзесяцігоддзе XX стагоддзя, для савецкіх людзей быў годам паспяховага завяршэння пяцігодкі. Вялікі ўклад у дасягненні нашай Радзімы ўнесла і Савецкая Беларусь, якая першага студзеня адзначыць сваё 52-годдзе.

Следуючы добрай традыцыі падводзіць напярэдадні Новага года вынікі зробленага і дзяліцца планамі на будучае, рэдакцыя вырашыла звярнуцца да чытачоў «Голасу Радзімы», да нашых пастаянных карэспандэнтаў з просьбай адказаць на наступныя пытанні:

1. Якім быў для Вас год адыходзячы! Якімі важнымі падзеямі быў ён адзначаны! Ці ўнёс ён якія-небудзь змены ў Ваша жыццё!

2. Якія цікавыя сустрэчы былі ў Вас у 1970 годзе!

3. Ці пабывалі Вы сёлета ў родных мясцінах! Якую ролю ў гэтым адыгралі Беларускае таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом і наша газета!

4. Ваша самае яркае ўражанне ад знаходжання на Радзіме!

5. Ці плануеце Вы наведаць Радзіму ў будучым! Калі так, то якім чынам: у складзе турысцкай групы або па прыватнай візе; адны або з сям'ёй, з сябрамі!

6. Ці ёсць сярод Вашых знаёмых людзі, якія зацікаўлены ў атрыманні «Голасу Радзімы»!

7. Якія матэрыялы з апублікаваных у «Голасе Радзімы» Вам спадабаліся і запомніліся! Што Вы хацелі б прачытаць на яе старонках у будучым! Якія новыя раздзелы, рубрыкі, тэматычныя старонкі хацелі б Вы ўбачыць у «Голасе Радзімы» ў будучым годзе!

8. Ці хочаце Вы прачытаць у «Голасе Радзімы» артыкул аб Вашых родных месцах!

9. Вашы пажаданні Радзіме, яе народу, родным і блізкім у будучым годзе!

Спадзяёмся ў бліжэйшы час атрымаць Ваш адказ на гэтыя пытанні.

Загадзя ўдзячны.

СОНЕЧНЫ КЛОУН

Нямала зорак цыркавога мастацтва дэманстравалі сваё майстэрства пад купалам мінскага цырка, але сустрэча жыхароў беларускай сталіцы з праслаўленым савецкім клоунам Алегам Паповым была сапраўдным святам.

Па-рознаму прыходзяць людзі ў мастацтва. Алег нарадзіўся ў Маскве. І трэба ж так здарыцца, што жыў ён якраз побач з адзіным у той час у свеце цыркавым вучылішчам. У 14 год Алег Папоў паступае ў гэта вучылішча, дзе за два гады авалодвае складаным майстэрствам цыркавога артыста. Спачатку ён выступае не як клоун, а як эквілібрыст і жанглёр. Прызнанне і поспех не прымусілі доўга чакаць. У 28 год Алег Папоў—народны артыст РСФСР. Яму апладзіруюць гледачы Амерыкі, Англіі, Францыі, Італіі, Бельгіі, Галандыі... Вось і цяпер Алег прыехаў да нас у Мінск адразу ж пасля гастроляў у Паўднёвай Амерыцы.

Папулярнасць «сонечнага клоуна», як яго «ахрысцілі» за рубяжом, сапраўды велізарная. Шырокая, у чорна-белую клетку, як шахматная дошка, кепка Алега Папова вядома і дарослым і дзецям. Яго рэпрызы заўсёды цікавыя і захапляючыя. У адных пераважае эквілібрыстыка, другія пабудаваны на жангліраванні, трэція — на акрабатыцы, але больш за ўсё ў рэпертуары Папова ўсё ж чыста клоунскіх сюжэтаў, дзе ў адно зліваюцца высокае майстэрства і выключная імправізацыя таленавітага коміка.

Алег ПАПОЎ на арэне Мінскага цырка.

Фота і тэкст А. ГЛІНСКАГА.

ГУМАР

Жанчына ўжо ў гадах пераходзіла вуліцу, і яе злёгку зачапіў лёгкавы аўтамабіль. Дзяжурны паліцэйскі ўсё ж выклікаў санітарную машыну. У чаканні прыезду «хуткай дапамогі» ён задаў жанчыне звычайныя ў такіх выпадках пытанні аб прозвішчы, адрасе, тэлефоне. Пацярпеўшая адказвала дакладна і выразна. Калі ж ён спытаў пра ўзрост, яна нервова правяла рукой па лбе: «Ну, хто можа памятаць гэту падрабязнасць у такую мінуту!»

***

— Ты ўсё яшчэ не жанаты? — здзівіўся першы. — Табе ж ужо трыццаць пяць!

— На жаль, — уздыхнуў другі. — Колькі дзяўчат знаёмлю з маці, ніводная ёй не спадабалася. Нядаўна сустрэў адну — дакладная копія маці. Але і гэта не падышла...

— Чаму?

— Не спадабалася бацьку.

***

Мастак скардзіцца свайму сябру пісьменніку:

— Цэлы год не магу прадаць карціну, якую намаляваў за дзень.

Пісьменнік:

— Дружа мой, дык ты малой цэлы год, тады глядзіш — прадасі за дзень.

***

— Вы давалі аб'яву аб тым, што шукаеце кухарку?

— Так. Вы добра гатуеце?

— Двума спосабамі.

— Што гэта азначае?

— Вельмі проста. Я магу накарміць гасцей так, што яны будуць рады прыйсці яшчэ раз, і магу падаць такую страву, што яны будуць абыходзіць ваш дом.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

НАШ АДРАС: МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82 33-03-15, 33-15-15, 39-87-92.

Мінск. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. № 1547.